

# Малады-крэатыўны, халасты-перспектыўны!

Юрыя Пахомава ўпершыню заўважыла на раённым мерапрыемстве, дзе ён цудоўна спраўляўся з роляй вядучага. Яшчэ тады пра сябе падумала: "Абавязкова трэба гэтага хлопца на першую паласу газеты". Потым была думка напісаць матэрыял да прафесійнага свята, але на той момант Юра знаходзіўся ў Мінску. І вось зусім выпадкова выпала магчымасць пазнаёміцца. Сам юнак родам з Трасціно. Ён скончыў універсітэт культуры і мастацтваў, атрымаў спецыяльнасць рэжысёр тэатра. Дарэчы такіх маладых і крэатыўных людзей я не бачыла даўно. Пасля кароткай гутаркі стала ясна: пра Юру трэба не пару радкоў пісаць на першую старонку, пра яго захапленні і дасягненні можна нават цэлы артыкул накатаць. Гэта сапраўды вельмі living рознабакова развітая асоба. Ён спрабаваў сябе ў розных накірунках: мадэлі, сольнага спевака, дызайнера адзення, здымаўся нават у фільмах і рэкламных роліках. Не буду пералічваць усе фестывалі і кастынгі, у якіх прымаў удзел Юра, іх занадта многа, але калі ёсць жаданне, кожны можа адкрыць Інтэрнэт. Упэўнена - самае лепшае чакае яго наперадзе. Напрыканцы Юрый прызнаўся, што мае жаданне прыняць актыўны ўдзел у конкурсе для крэатыўных дызайнераў, які праводзіць наша раённая газета. Што ж, будзем чакаць цікавых, смелых і неардынарных ідэй. Упэўнена, у Юрыя іх не адзін дзясятак.

**Вольга МІРАВА.**
**Фота з архіва Юрыя**

**Мірава, В.** Малады – крэатыўны, халасты – перспектыўны! : [ пра Юрыя Пахомава ] / Вольга Мірава // Шлях Кастрычніка. — 2016. — 2 лістапада. — С. 1.